Любы пажар — летняю парой — на працяглую хваробу, а зімоваю — на мароз. Калі спячы прымаў удзел у тушэнні пажару, то яго чакае цяжкая работа на спякоце ці марозе, і да таго ж — работа нечаканая.

Никифоровский. Материалы, с. 137.

Пярун пачуць — надзвычайная навіна.

Васілеўскі, с. 26.

Пясок бачыць: чысты — на дабро, **брудны** — кепска, нядобры чалавек падвядзе. Перасыпаць пясок — плёткі сцеражыся.

Пясчаны бераг — у вастрог пасадзяць.

Ляцкий. Материалы, с. 140.

Сніцца пясок — будзеш на пахаранах.

Pietkiewicz, s. 83.

Вар.: Fed., s. 214.

Раку, калі вялікую — слёзы вялікія табе будуць. Таксама: радасць. Таксама: быць у гасцях. Таксама: важная размова. А калі малую раку ўбачыш — малыя і слёзы (гл. **Вада**).

Романов. Опыт, с. 57.

Раку бачыць — **чыстую** — слёзы; тое ж: добра, на багацце; **мутную і да таго ж шырокую** — плёткі, а то й бітва.

Ляцкий. Материалы, с. 140.

Рака з вадою чыстаю — добра; **з мутнаю,** бузяністаю — дрэнна.

Васілеўскі, с. 26.

Роў — магіла, няшчасце, балець; тое ж: цяжкія роды. **Пераходзіць роў** — выздараўленне, тое ж: добры чалавек знойдзецца (гл. **Яма**).

Ляцкий. Материалы, с. 140.

Ручаёк глыбокі, празрысты — шчасце; **неглыбокі** — ні дрэнна, ні добра. **Ручаёк цякучы бачыць** — часткова спаўняцца твае задумы.

Васілеўскі, с. 27, 33.

Сажу бачыць — добра, грошы будуць, сваты; тое ж: чорт да цябе прыйдзе.

Ляцкий. Материалы, с. 141.

Свет — радасць, добрая навіна, госць будзе (гл. **Сонца**).

Ляцкий. Материалы, с. 141.

Снег бачыць — смех будзе.

Романов. Опыт, с. 57.

Снег — труды. **Хадзіць па снезе** — піраваць.

Ляцкий. Материалы, с. 141.

Снег як сніцца, як па снегу ходзіш — смерць у сяле.

Moszynski, s. 152.

Снег сніць — па лету вельмі горача, **а зімою** — адлега.

Серж., с. 41.

Соль бачыць і есці — засмучэнне. Таксама: далёкая дарога.

Романов. Опыт, с. 58.

Сонца бачыць — добра; **узыход сонца** — дужа добра: пасвячае цябе Гасподзь.

Романов. Опыт, с. 57.

Сонца — муж будзе любіць, жыта ўродзіць; сонца **ўзыходзіць** — добрае жыццё табе будзе (гл. **Месяц**); **заходзіць** — дзеці шанаваць будуць. **Сонца і ваду бачыць** — лепш заўсягo, шчасце; тое ж: **хлопцу** — нявеста, **дзяўчыне** — жаніх.

Ляцкий. Материалы, с. 141.

Як таска чалавеку і сонца сніцца, то тая таска зыйдзе.

Moszynski, s. 152.

Сонца сніць на захадзе — кепска, **на ўсходзе** — вельмі добра.

Серж., с. 41.

Туман паказвае, што ў таго чалавека цёмная жытка.

Серж., с. 41.

Хмару навальнічную — напасць табе будзе (гл. **Навальніца**).

Романов. Опыт, с. 58.

Хмару цёмную сніць — будзе няшчасце ці што другое страшнае.

Серж., с. 42.

Хмару цёмную бачыць — неспакой, клопат; **хмуры светлыя** — напрасная трывога.

Васілеўскі, с. 32.

Яму бачыць і ўпасці ў яе — бяда здарыцца. (Параўн. магіла).

Романов. Опыт, с. 58.

Яма — людзі яму капаюць, гаворка нягодная. **Магілу выкапаную бачыць** — добра; тое ж: трэба быць асцярожным: увалісся — бяда будзе, **а пройдзеш** — дзела нічым кончыцца (гл. **Роў, Гара**).

Ляцкий. Материалы, с. 141.

Пабачыш ува сне яму, то або памрэш, або прыйдзе на цябе вялікае няшчасце.

Pietkiewicz, s. 82.

Вар.: Fed., s. 213.

Яма, у яе ўваліцца — паважная няўдача.

Васілеўскі, с. 37.

Ямку на дрэва падрыхтаваць — радасць, удача.

Васілеўскі, с. 37.

"Беларускі народны соннік", ВЦ "Бацькаўшчына".

После эстрадной карьеры и серий скандальных историй Андрей Разин "брошен" на подъем ставропольской культуры

Поставлена наконец точка в беспрецедентном судебном разбирательстве, длившемся полтора года, между двумя известными на Ставрополье людьми — заместителем начальника УВД края полковником милиции Николаем Кривцовым и скандально известным лидером "Ласкового мая" Андреем Разиным.

Осев несколько лет назад в родных краях на Ставрополье, бывший кумир советских тинейджеров бросился в политику: он рвался в местные думцы, в губернаторы, в Госдуму России... Инициирующий скандал за скандалом, Андрей Разин стал постоянным "героем" местной прессы, а в недавнем времени — и центральной. Например, у всех на слуху история с покупкой Разиным родительского дома и "опекой" престарелой мамы Михаила Сергеевича Горбачева.

Разин — "многостаночник", критикует, разоблачает, "доводит до общественного мнения" собственные сенсационные версии, терроризирует "личных врагов" угрозами, засыпает суды исками к журналистам, правоохранительным органам и прочим гражданам...

Полковник милиции, герой Чечни, один из лучших профессионалов в борьбе с оргпреступностью, Николай Кривцов — единственный человек в крае, сделавший решительный шаг, чтобы остановить шоумена, обвинившего его в преступлениях в прямом эфире местного вещания.

Полтора года понадобилось судам Ставрополья, чтобы вынести решение по довольно прозрачному, несложному делу, которое издевательски затягивал профессиональный скандалист. Даже на последнем судебном заседании Разин разыграл очередную фарсовую сцену, заявив о сверхсекретных сведениях, которые он должен-де огласить в отсутствие (уже надоевших ему!) журналистов. Но финт уже не удался.

Судья Ленинского райсуда Ольга Денисова удовлетворила иск милиционера: за насквозь лживые, оскорбляющие честь и достоинство утверждения в отношении Кривцова Разин обязан принести ему публичные извинения и возместить моральный ущерб в сумме 50 миллионов рублей.

На суде бывший поп-певец попытался "пожалиться": он, мол, гол как сокол, нет у него ни денег, ни недвижимости. Наверное, забыл, как хвалился недавно на страницах печати покупкой нового "мерседеса".

Небезынтересная деталь: такой же приговор, вынесенный в свое время той же самой судьей О.Денисовой, краевой суд отменил как незаконный, ибо изобретательный Разин обрушил на краевую коллегию новые "свидетельства", требовавшие-де проверки.

Имя "ласковомаевца" теперь фигурирует и в другой, шокирующей многих новости: ярчайший представитель попсы месяц назад назначен... директором Ставропольской государственной филармонии, что вызвало настоящий шок среди интеллигенции края.

Новый директор намерен внедрять здесь "творческий и организационный опыт "Ласкового мая", о чем со свойственной ему претенциозностью и безапелляционностью рассказал на страницах местной прессы: будет создан "краевой музыкальный концерн на базе Дворца культуры профсоюзов и филармонии", который возьмет в свои руки организацию в крае всех гастролей, в том числе и "звезд" отечественной культуры. "Никаких отмен концертов и самостоятельности в этом отношении не будет, — сурово пообещал шоумен, поведав о тактике взращивания собственных "звезд". — Еще в практике с "Ласковым маем" мы брали в пристяжку неизвестного артиста и таким образом его раскручивали. Поэтому, если какая-то "звезда" поедет по Ставропольском краю, мы будем предлагать наших артистов в первом отделении".

И попробуй какие-то там Леонтьев, Киркоров или Долина с Пугачевой отказаться от "пристяжки" разинских "ласковомаевцев" конца 90-х — они будут иметь дело с человеком, с которым не мог совладать ни бывший президент СССР, ни один из главных милиционеров края, ни даже судьи с первого захода.

А еще в плане одного из главных ныне пропагандистов культуры Андрея Разина записана такая задача: "Создать при правительстве края эстрадно-симфонический оркестр по типу президентского".

И впрямь: чего мелочиться!

На днях интеллигенция Ставрополья ошарашенно обсуждала еще один взлет на олимп ставропольской культуры бывшего поп-певца Андрея Разина: ему доверены бразды правления еще и в местном отделении Фонда культуры!

Л.БЕЛЬДЮГИНА.

("РГ")

Оспы больше не будет

Последний день в жизни образцов вируса оспы — этого смертоносного врага человечества — наступит в середине последнего года нашего тысячелетия, 30 июня 1999 года. Всемирная организация здравоохранения приняла решение уничтожить их в соответствии с планом, одобренным медицинскими представителями 190 стран.

Оспа — это пока единственная инфекционная болезнь, борьба с которой закончилась полной победой. Уничтожение ее вируса станет последним этапом в искоренении оспы и первым намеренным уничтожением какого-либо биологического вида. Последние образцы вируса оспы сейчас хранятся в замороженном виде в Центре по контролю за заболеваемостью в Атланте и в Российском вирусологическом центре в Кольцово.

Представители ВОЗ в дальнейшем планируют хранить для исследовательских целей только отдельные генетические фрагменты вируса, которые не способны вызвать инфекцию. Страны, входящие в ВОЗ, сохранят запасы противооспинной вакцины, достаточной для иммунизации 500 тысяч человек. Вакцина приготовляется из сравнительно безобидного вируса, аналогичного оспенному. Образцы такого вируса на случай, если вакцины понадобится больше, будут храниться в Национальном институте здравоохранения Нидерландов.

"Интернетизм" ученые сравнивают с алкоголизмом

Злоупотребления работой в компьютерной сети "Internet" могут вызвать проблемы медицинского характера, сообщил журнал канадской медицинской ассоциации. Ссылаясь на исследование, проведенное в университете Питтсбурга, ученые отметили: у тех, кто проводит в мировой компьютерной сети больше двадцати часов в неделю, развивается болезненное пристрастие к этому занятию, что создает проблемы социального характера. "Интернетизм" ученые сравнивают с алкоголизмом. Заболевание сопровождается потерей контроля над ситуацией, синдромом социальной изоляции, развалом семьи, падением академической успеваемости, залезанием в долги и потерей работы.

ЭКСТРА-ПРЕСС.

Вам совет...

Эротический кодекс

К мелким уловкам прибегали прежде женщины, когда хотели познакомиться с мужчиной. Например, роняли носовой платок, чтобы облюбованная жертва подняла его. Сегодня тому, кто ищет партнера, не нужно следовать этим сложным правилам поведения. Что отнюдь не облегчает знакомство. А даже наоборот! Отсутствие правил может вызвать неуверенность и привести к поражению.

Как в наши дни женщина даст понять, что мужчина ей нравится? Или, наоборот, как вежливо отделаться от него? Как ей тактично довести до его сведения, что флирт на отдыхе оканчивается с последним днем отпуска?

Сегодня помимо брака существует множество видов отношений между мужчиной и женщиной. Этот факт, а также отсутствие строгих правил поведения обычно приводят к неясности ситуации, утверждает голландская писательница Инес ван Эйк в своей книге "Ко мне и к тебе". Согласно подзаголовку, издание является собранием правил "эротического этикета", с помощью которого автор хотела бы восполнить пробел в данной области. В ней даются советы о том, как вести себя в тот или иной период знакомства, начиная с первого взгляда и до совместного завтрака.

Как, например, молодая женщина может узнать, что привлекательный мужчина не случайно пришел в компанию один и у него действительно нет подруги? В такой ситуации ни в коем случае нельзя задавать прямые вопросы о его семье, что может отпугнуть мужчину. Следует подойти к теме более тонко, более рафинированно.

Темп знакомства можно ускорить, если, например, сказать: "Я с удовольствием побеседую с вами, но тут слишком шумно. Я знаю поблизости одно тихое местечко". Тот, кто не хочет продолжать знакомство, может попрощаться таким образом: "Надеюсь, мы еще увидимся".

Так как все больше людей в поисках партнера прибегают к помощи газетных объявлений, автор дает совет: используйте как можно меньше сокращений и прибегайте к ясным и четким формулировкам, что поможет избежать недоразумений.

Если вы в кого-то влюбитесь во время отпуска, по возможности, растяните флирт и лишь в конце отбросьте все стеснения. Эта тактика помешает партнеру ощутить "отпускное похмелье": после быстрого сексуального приключения отношениям приходит конец, а между тем ежедневно приходится встречаться друг с другом в гостинице, ресторане, на пляже.

Если хотите познакомиться с женщиной, тщательно продумайте первую фразу. Комплименты действуют лишь тогда, когда они не чрезмерны. Рискованно также в качестве первого шага прибегать к остроумию, потому что не все смеются над одними и теми же шутками. Неуместны также и общие фразы: "Можно мне сесть с вами? Я с большим удовольствием съем устрицы в вашем обществе". Ведь на это вполне закономерно может последовать ответ: "Тогда закажите что-нибудь другое!" Если первые фразы сложатся удачно, нужно постараться избежать следующей ловушки: многие люди, стремясь импонировать собеседнику, совершают ошибку, слишком много рассказывая о самих себе. Тогда как следовало бы проявить интерес к другому.

К счастью, не первые фразы обычно определяют будущее отношений. Так, в книге приводятся слова двадцатилетней девушки: "Если парень нравится, то совершенно все равно, что он говорит. А если он дурак, то тогда тем более все равно".

ЭКСТРА-ПРЕСС.

Скажы, Марыя...

Каштоўныя камяні адрозніваюцца і па цане

Не магла б ты, Марыя, паведаміць, якія каштоўныя камяні найбольш даражэйшыя.

Алена,

г.Рэчыца.

Сапраўды, каштоўныя камяні падраздзяляюцца на некалькі відаў.

Найбольш цэняцца брыльянты, ізумруды, сапфіры і рубіны. Калі вы будзеце, напрыклад, купляць залаты пярсцёнак, упрыгожаны сапфірам, то, напэўна, заўважыце, што ён каштуе нічым не менш, чым рэч з брыльянтам.

Далей ідуць проста каштоўныя камяні, якіх вялікая колькасць. Іх кошт звычайна залежыць ад моды. Напрыклад, зараз на Захадзе ўвайшоў у моду александрыт, і адразу ўпрыгожванні з гэтым каменем падскочылі ў цане.

А трэцяя катэгорыя каштоўных камянёў — гэта біруза, нефрыт, агат і іншыя.

Яшчэ адна цікавая інфармацыя. Калі вы набылі каштоўнае ўпрыгожванне ў камісійным магазіне, абавязкова некалькі хвілін патрымайце яго пад струменем халоднай вады. Кажуць, што так рэч ачышчаецца ад былых уплываў.

Ганаровым донарам — пенсія незвычайная

Я, ганаровы донар Рэспублікі Беларусь, атрымліваю пенсію па інваліднасці, але ніякіх даплат як донар не маю. Ці справядліва гэта?

Вадзім Мікалаевіч,

г.Мінск.

Як растлумачылі мне ў Міністэрстве сацыяльнай аховы Рэспублікі Беларусь, павышэнне пенсіі ў памеры 10 працэнтаў донарам, якія ўзнагароджаны знакамі "Ганаровы донар Рэспублікі Беларусь", "Ганаровы донар СССР", а таксама "Ганаровы донар Таварыства Чырвонага Крыжа БССР", адбываецца толькі ў тым выпадку, калі донары дасягнулі агульнапрынятага пенсійнага ўзросту: мужчыны — 60 гадоў, жанчыны — 55.

Дзе шукаць грэка-каталіцкую царкву?

"Народную волю" чытаю з першага нумара. Шчыра прашу, надрукуйце ў паважанай мною газеце адрас і час службы грэка-каталіцкай царквы Мінска і Маладзечна.

І.І.Крупко,

Маладзечанскі раён.

У Дзяржаўным камітэце па справах рэлігіі і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь я даведалася, што ў Мінску грэка-каталіцкая царква знаходзіцца на вуліцы Прытыцкага, 42. Калі вы жадаеце даведацца пра часы службы, а таксама атрымаць іншую інфармацыю, тэлефануйце ў царкву па нумары (8-017) 252-90-18.

Што тычыцца Маладзечна, то грэка-каталіцкая царква гэтага горада зарэгістравана па адрасу: г.Маладзечна, вул.Хмяльніцкага, д.6б, кв.12. Тэлефона там, на жаль, няма.

Колькі каштуе падручнік для бацькоў?

Чула, што наш урад прыняў пастанову, згодна з якой бацькам прыйдзецца плаціць за школьныя падручнікі. Цікава было б даведацца, хто і ў якім памеры будзе вызначаць іх кошт.

Г.П.Кабяк,

г.Віцебск.

Сапраўды, у маі гэтага года Савет міністраў прыняў пастанову "Аб парадку ўтрымання платы за карыстанне навучэнцамі падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі", згодна з якой у 1997 годзе бацькам прыйдзецца плаціць 25 працэнтаў ад кошту школьных падручнікаў. А вызначаць кошт комплексу падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў даручана Міністэрству адукацыі па ўзгадненню з Міністэрствам эканомікі і Міністэрствам фінансаў.

Праўда, бацькам, дзеці якіх вучацца ў спецыяльных агульнаадукацыйных школах-інтэрнатах, а таксама ў класах інтэграванага навучання і класах для дзяцей з недахопамі разумовага і фізічнага развіцця ў агульнаадукацыйных школах, плаціць не прыйдзецца.

Па-ранейшаму бясплатнымі застануцца падручнікі ў спецыяльных школах для дзяцей, якія маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання, у агульнаадукацыйных санаторных школах-інтэрнатах і лагеры "Зубраня".

Не будзе ўтрымлівацца плата з сем'яў, "сукупны даход якіх на члена сям'і ў месяц за мінулы каляндарны год не перавышае трохразовай велічыні мінімальнай заработнай платы з улікам індэксацыі па стану на снежань папярэдняга года", і з сем'яў, дзе адзін або абодва бацькі інваліды.

Бясплатна будуць прадастаўляцца падручнікі дзецям-сіротам і дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў.

Калі ў сям'і выхоўваецца трое або болей школьнікаў, плата на падручнікі для такіх сем'яў будзе зніжана на 50 працэнтаў.

Дзе размясціліся дыпламатычныя прадстаўніцтвы на Беларусі?

Жыву недалёка ад Мінска, але не хочацца губляць час на дарогу, калі не ведаеш, ці вырашыш свае пытанні ў сталіцы. Калі ласка, Марыя, паведамі адрасы і тэлефоны дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных краін у нашай рэспубліцы.

І.І.Була,

Слуцкі раён.

Цяперашнім часам у Беларусі размешчаны амбасады 8 краін былога Савецкага Саюза і генеральнае консульства Эстоніі (яго адрас: г. Мінск, вул. Варвашэні, 17, тэл. (8-017) 234-59-65).

На вуліцы Кірава, 17 "прапісаліся" Пасольствы Украіны (тэл. (8-017) 227-28-61), Арменіі (тэл. (8-О17) 227-51-53) і Туркменістана (тэл. (8-017) 222-34-27). На Кірава, 17 можна адшукаць і Паўнамоцнага Прадстаўніка Грузіі (тэл. (8-017) 222-30-90).

Амбасада Расійскай Федэрацыі размяшчаецца на вуліцы Старавіленскай, 48 (тэл. (8-017) 250-36-66, 250-36-65). На гэтай жа вуліцы, толькі ў доме №57, знаходзіцца Пасольства Кыргызскай рэспублікі (тэл. (8-017) 234-91-17).

Амбасады Латвіі і Літвы знаходзяцца адпаведна на вуліцы Старажоўскай, 15 (тэл. (8-017) 239-16-12) і Варвашэні, 17 (тэл. (8-017) 234-77-84, 234-72-00). Адрас Пасольства Рэспублікі Малдова: праспект Машэрава, "Дразды", д.32 (тэл. (8-017) 250-39-52), Пасольства Рэспублікі Казахстан: вул.Куйбышава, 12 (тэл.: (8-017) 234-99-37).

У беларускай сталіцы нясуць свае дыпламатычныя місіі прадстаўнікі дыпламатычнага корпусу больш чым з 10 краін дальняга замежжа. На Бранявым завулку, 5 размяшчаецца Амбасада Рэспублікі Балгарыя (тэл. (8-017) 227-55-00), на вуліцы Румянцава, 6 — Амбасада Рэспублікі Польшча (тэл. (8-017) 213-41-14, 213-43-13), на завулку Масквіна, 4 — Амбасада Румыніі (тэл. (8-017) 223-80-97).

На вуліцы К.Маркса, 37 знаходзяцца Пасольствы Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі (тэл.: (8-017) 229-23-03, 229-23-04), а таксама Амбасада Італьянскай рэспублікі (тэл. (8-017) 229-29-69). На плошчы Свабоды, 11 размяшчаецца Пасольства Французскай рэспублікі (тэл. (8-017) 210-28-68).

Калі вам трэба трапіць у Пасольства Германіі, то яго адрас: вул.Захарава, 26 (тэл.: (8-017) 233-07-52, 233-27-14), а аддзел віз гэтай краіны размяшчаецца на вул.Старавіленскай, 44 (тэл. (8-017) 234-00-87).

Пасольства Дзяржавы Ізраіль знаходзіцца на Партызанскім праспекце, 6а (тэл. (8-017) 230-44-44), Рэспублікі Індыя — на вул.Кальцова, 4, корп.5 (тэл. (8-017) 262-93-99), а Кітайскай Народнай Рэспублікі — на вуліцы Берасцянскай, 22 (тэл. (8-017) 222-44-95).

На вуліцы Валадарскага, 6 "прапісалася" Пасольства Турэцкай рэспублікі (тэл. (8-017) 227-14-08), на Бранявым завулку, 5а — Чэшскай рэспублікі (тэл. (8-172) 236-34-50).

Адрас Пасольства ЗША: вул. Старавіленская, 46 (тэл.: (8-017) 231-50-00, 226-16-07), Пасольства Японіі — праспект Машэрава, 23, корп.1, 8-ы паверх (тэл.: (8-017) 223-60-37, 223-62-33).

У Мінску мае сваё дыпламатычнае прадстаўніцтва і Ватыкан. Яго пасольства — Апостальская нунцыятура— размяшчаецца на вуліцы Валадарскага, 6 (тэл. (8-017) 276-85-84).

Раздзел вядзе Марыя НАРЭЙКА

Крымінал

Бывай, зброя!

Зброя, якая незаконна знаходзіцца ў нашых грамадзян, прычыняе шмат клопатаў праваахоўным органам. Нямалая яе колькасць канфіскуецца ў ходзе спецыяльных аперацый "Арсенал", іншых аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, а таксама ў штодзённай дзейнасці міліцыі. Вось аб якіх фактах, што мелі месца на працягу толькі аднаго дня, расказвае супрацоўнік прэс-службы МУС рэспублікі Тамара Гурэцкая.

У Віцебску супрацоўнікі Упраўлення крымінальнага вышуку УУС аблвыканкама затрымалі вучня 11 класа сярэдняй школы, у якога пры асабістым аглядзе і вобыску па месцы жыхарства знойдзены і канфіскаваны рэвальвер сістэмы "Наган" 1939 года выпуску, 750 патронаў да пісталета "ТТ", 10 тратылавых шашак.

У Мінску аператыўнікі з МУС і Кастрычніцкага РУУС сталіцы затрымалі жыхара Азербайджана, які знаходзіўся тут праездам. У яго былі знойдзены самаробны пісталет калібру 5,6 мм з 12 патронамі і наркасыравіна. 614 малакаліберных патронаў на сталічнай Камароўцы канфіскаваў нарад патрульна-паставой службы міліцыі Савецкага РУУС у двух нідзе не працуючых грамадзян. І тут жа, на рынку, затрыманы злачынца, які ў 16.30 уварваўся ў магазін "Птушка" і, пагражаючы пісталетам, адабраў у прадаўцоў 56 мільёнаў рублёў. Калі яго затрымалі, высветлілася, што пісталет, з якім ён пайшоў "на справу", цацачны. Але паспрабуйце адрозніць сённяшнюю цацку ад сапраўднага "ствала"! Так што і з гэтай "зброяй", якая будзе прыкладзена да крымінальнай справы, гаспадару прыйшлося развітацца.

Сяргей ЦІВАНАЎ.

У нашых суседзяў

Ігналінская АЭС засталася без імпарцёраў

Ігналінская АЭС, якая працуе толькі на 25 працэнтаў сваёй магутнасці, страціла апошняга імпарцёра электраэнергіі: з-за высокай цаны адмовілася купляць яе і Латвія. Вясной бягучага года ад літоўскай электраэнергіі адмовілася Калінінградская вобласць, а з 1 ліпеня — Беларусь.

Днямі ў тэрміновым парадку былі зроблены спробы правесці перагаворы аб экспарце электрычнасці з Літвы на Украіну, дзе зведваюць асабліва вялікі энергадэфіцыт. Аднак Украіна, якая перажывае глыбокі эканамічны крызіс, не знайшла валюты для гэтых мэт.

У абстаноўцы, калі суседнія краіны не купляюць электрычнасць Ігналінскай АЭС, забяспечыць дастатковую рэнтабельнасць і працаздольнасць такога гіганта можна будзе толькі за кошт унутранага спажывання. А яно не ўзрастае, таму што вытворчасць пастаянна скарачаецца, энергаёмістыя прадпрыемствы становяцца банкрутамі. Значыць, ёсць рэальная пагроза павышэння цаны кілават/гадзіны.

Таксама дэмакратыя...

Мэр горада Каўнаса, які з'яўляецца крэпасцю правых палітычных сіл Літвы, забараніў пікеты, мітынгі і дэманстрацыі пратэсту супраць улад у цэнтры горада — на праспекце Свабоды, Ратушнай плошчы і ва ўсіх іншых месцах. Устаноўлена, што ў далейшым апазіцыянеры змогуць бесперашкодна мітынгаваць толькі ў трох месцах горада — на востраве на Нёмане, плошчы ля сутокі рэк Нёман і Нярыс і Пеўчым полі каля чыгуначнага вакзала.

Лідэр самай радыкальнай палітычнай арганізацыі — Саюза свабоды Літвы — дэпутат гарадскога Савета Вітаўтас Шустаўскас заявіў, што яго арганізацыя не падпарадкуецца такому рашэнню мэра і, калі будуць павышацца цэны на цяпло і электраэнергію, дэманстрацыю пратэсту правядзе каля мэрыі горада.

Ацяпленне гарадоў і пасёлкаў — на водкуп мясцовым уладам

Да гэтага часу ў Літве дзейнічала цэнтралізаваная сістэма забеспячэння краіны цяплом, якая склалася яшчэ ў гады савецкай улады. АТ "Летувас энергія", якое падпарадкоўвалася непасрэдна ўраду, закупляла паліва, абсталяванне і размяркоўвала іх па гарадах і раёнах. Устанаўліваліся таксама адзіныя цэны за ацяпленне будынкаў і гарачую ваду. Цяперашняму ўраду правых такая ноша здаецца вельмі цяжкай і нерацыянальнай, і ён прыняў рашэнне поўнасцю перадаць ацяпляльную гаспадарку гарадскім і раённым Саветам. Пачаўся працэс раздраблення АТ "Летувас энергія" на дробныя гарадскія і пасялковыя АТ.

Людзей хвалюе не сам працэс раздраблення буйной сістэмы энергазабеспячэння, а маючы адбыцца рост цэн, які прагназіруецца літаральна паўсюдна. Рэкорд кошту цяпла збіраецца пабіць г.Шаўляй, дзе цеплагаспадарка самая старая. У гэтым горадзе ацяпленне аднаго квадратнага метра плошчы будзе каштаваць 4,5 літа (1,125 долара ЗША) у месяц.

Альгімантас БРАЗАЙЦІС, БелТА.

ШАХМАТЫ

Этюд М.Ботвинника

a b c d e f g h

Выдающийся гроссмейстер, пятикратный чемпион мира Михаил Моисеевич Ботвинник (1911—1995) высоко оценивал значение шахматной композиции. В одной из своих статей он писал: "Даже мастера должны уделять достаточное внимание этюдной композиции. Решение этюда приучает к конкретному мышлению и точному расчету. Всякие пуанты и ложные следы должны улавливаться быстро и не сбивать с правильного пути". Свой первый этюд Михаил Ботвинник составил в 14-летнем возрасте в соавторстве с талантливым ленинградским шахматным композитором Сергеем Каминером, впоследствии репрессированным в 1937 году и погибшем в Гулаге.

М.Ботвинник, С.Каминер

Белые: Кра1, Фа2, Cd2, пп. f3, g2(5).

Черные: Крh5, Фg7, Cg6, Kd3, п. e5(5).

Выигрыш.

У черных материальный перевес, но ход белых, и им необходимо максимально использовать это обстоятельство. Путь к победе очень эффектен. 1. g4+Крh4 2. Ch6! Жертвуя еще одной фигурой, которую черные вынуждены взять ввиду двойной угрозы: 3. Фh2x и 3. C:g7. 2...Ф:h6 3. Фh2+Крg5 4. Фd2+Kf4 5. Фd8x! — красивый диагональный мат.

Хроника

В международном турнире в Белостоке (Польша) приняло участие 27 спортсменов из России, Польши и Беларуси. Соревнования проводились по швейцарской системе в 9 туров. В напряженной борьбе первый приз завоевал международный гроссмейстер из Москвы Валерий Чехов, набравший 6,5 очка — без поражений. Такой же результат у международного мастера из Польши Станислава Костыры, но он уступил победителю по таблице коэффициентов. Лучший результат из белорусских спортсменов показал кандидат в мастера из Минска Юрий Бучков — 6 очков, четвертое место. У минчанина Андрея Качанова — 5,5 очка, он получил седьмое место.

Зато в соревнованиях по быстрым шахматам доминировали наши шахматисты. Первый приз с результатом 8 очков из 9 возможных получил минчанин мастер спорта Абрам Ройзман. На пол-очка отстал кандидат в мастера Иозас Дабкус (Гродно). А третье место выиграл Андрей Качанов. В турнире участвовало 14 спортсменов, на обдумывание ходов отводилось по 25 минут каждому игроку.

ШАШКИ

И числом, и умением

Именно так можно сформулировать принцип, с помощью которого белые достигают выигрыша при своей очереди хода в приведенной ниже практической позиции.

a b c d e f g h

Белые: простые b4, b6, c1, d2, h2(5).

Черные: простые b8, f2, f4(3).

Материальное преимущество белых ощутимо. Однако черные простые занимают активные поля на доске, причем одна из простых находится на преддамочном поле. И тем не менее белые выигрывают. В основном варианте решения игра сводится к классическому этюду российского составителя А.К.Мишина.

Решения следует присылать по адресу: 220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, "Шашки".

Компьютер против человека

В Национальном центре шахмат и шашек прошел 12-й Международный шашечный турнир "Минск-97". Эти, ставшие уже традиционными, соревнования ведут свой отсчет с 1983 года.

На сей раз среди сорока двух участников, соревновавшихся в трех различных группах, выступали представители Нидерландов, России, Украины и Беларуси.

В главной гроссмейстерской группе первенствовали наши гости — международные гроссмейстеры россияне Владимир Мильшин, Александр Георгиев и Игорь Кирзнер (Украина), набравшие по 11 очков. У международного мастера из Минска Александра Булатова — 10 очков, четвертое место и выполнение нормы балла международного гроссмейстера.

В мастерской группе победителем стал международный гроссмейстер Андрей Калмаков (Россия) — 13 очков. На одно очко меньше у второго призера минчанина, международного мастера Сергея Носевича.

В массовой группе 22 участника соревновались по швейцарской системе в девять туров. Интересно, что впервые в нашей стране, да пожалуй вообще в странах СНГ, спор за награды вел компьютер. В данных соревнованиях это было детище фирмы "Дайнова". Машина играла легко и — главное — результативно. Шесть выигрышей при трех ничьих позволили компьютеру набрать в итоге 15 очков и уверенно занять первое место.

Любителям стоклеточных шашек предлагаем разобрать партию, в которой "Дайнова", играя белыми с чемпионкой Беларуси-97 среди женщин Людмилой Волковой, провела ошеломляющую семиходовую выигрывающую комбинацию.

1. 33—28 18—22 2. 38—33 12—18 3. 31—26 07—12 4. 42—38 01—07 5. 47—42 19—23 6. 28:19 14:23 7. 32—28 23:32 8. 37:28 10—14 9. 41—37 14—19 10. 37—32 09—10 11. 34—30 16—21 12. 30—24 19:30 13. 35:24 20:29 14. 33:24 22:33 15. 38:29 21—27 16. 32:21 11—16 17. 42—38 16:27 18. 46—41 03—09 19. 39—33 14—20 20. 33—28 05—10? (После этого ошибочного хода белые проводят комбинацию.) 21. 28—22! 17:28 22. 36—31 27:47 23. 26—21! 47:33 24. 29:38 20:29 25. 21—17 12:21 26. 38—33 29:38 27. 43:05, и через восемь ходов черные сдались.

Борис АГАШИН, мастер спорта.

Спорт

Кубак Дэвіса: пасля першага дня – нічыя

У Фінляндыі 11 ліпеня пачаўся матч Кубка Дэвіса ў Еўра-Афрыканскай зоне паміж мужчынскімі зборнымі гаспадароў і Беларусі. На грунтавых кортах горада Тамперэ разгарнулася ўпартая барацьба, паведаміў карэспандэнту БелТА прэзідэнт Беларускай тэніснай асацыяцыі Сямён Каган. Спачатку Аляксандр Швец у вельмі ўпартым пяцісэтавым паядынку ўступіў Віле Ліўка — 3:6, 6:7, 6:4, 6:4, 3:6. Затым лідэр беларускай каманды Уладзімір Валчкоў аднавіў раўнавагу, абыграўшы Томаса Кетолу — 6:3, 3:6, 7:6, 6:2.

У матчы прыблізна роўных сапернікаў, лічыць С.Каган, перамога той, хто будзе больш моцным перш за ўсе ў псіхалагічным плане. Наперадзе парная сустрэча, а завершыцца матч 13 ліпеня паўторнымі адзіночнымі паядынкамі.

Ігар ХАДАСЕВІЧ.

Летнія клопаты беларускіх хакеістаў

На першы трэніровачны збор прыбудуць 15 ліпеня кандыдаты ў нацыянальную зборную Беларусі па хакею. У распараджэнні трэнераў Андрэя Варывончыка і Міхаіла Захарава — трыццаць ігракоў, якія выступаюць за акіянам, у Германіі, Польшчы, а таксама ў маладзёжнай зборнай "Юнацтва".

Праграмай збору прадугледжаны заняткі на лёдзе, у зале атлетычнай падрыхтоўкі і басейне. Завершацца алімпійскія дэбютныя "агледзіны" перад алімпійскім Нагана 26 ліпеня.

Свае клопаты і ва ўдзельнікаў Усходне-Еўрапейскай хакейнай лігі. У цяперашнім першынстве, якое стартуе 13 верасня, выступяць 10 каманд: "Палімір" /Навапалацк/, "Нёман" /Гродна/, "Цівалі", "Юнацтва" /абедзве — Мінск/, "Сокал", "Сокал-2", "Ільдзінка" /усе — Кіеў/, "Энергія" /Электрэнай/, "Эсаміка" /Рыга/ і юніёрская зборная Латвіі.

Першы этап пройдзе ў чатыры кругі, затым каманды раздзеляцца на дзве падгрупы. У першай з іх, куды ўвойдуць шэсць лепшых клубаў, і будуць разыграны ўзнагароды чэмпіянату.

На другім этапе хакеісты пазмагаюцца за права валодаць Кубкам УЕХЛ, розыгрыш якога пройдзе па сістэме плэй-оф.

Вячаслаў ДУТАЎ, БелТА.

За апошні час Анна Курнікова дабілася значных поспехаў. Сёння яна па праву лічыцца зоркай сусветнага тэніса.

Дзень у гісторыі

16 ліпеня

У 622 годзе прарок Мухамед збег ад пераследу паганцамі з Мекі ў Медыну. Мусульмане ва ўсім свеце шануюць гэты дзень як пачатак новай эры. Віншуем мусульман Беларусі з Новым годам!

У 1661 годзе Стакгольмскі банк выпусціў першыя ў свеце банкноты.

У 1867 годзе француз Жазеф Манье запатэнтаваў вынайдзены ім жалезабетон. Ад гэтай падзеі можна весці адлік новай эры ў будаўнічай справе.

У 1872 годзе нарадзіўся нарвежскі падарожнік Роальд Амундсен, які першым дасягнуў Паўднёвага полюса.

У 1898 годзе пачалася стачка рабочых Віцебскай тытунёвай фабрыкі.

У 1916 годзе беспаспяхова скончылася наступальная аперацыя 4-ай рускай арміі ў раёне Баранавічаў. Дакладна праз год у сувязі з чарговым няўдалым наступленнем пачаліся стыхійныя выступы салдат супраць Часовага ўрада.

У 1941 годзе Гітлер на нарадзе вышэйшага кіраўніцтва нацысцкай Германіі заявіў, што акупаваныя савецкія землі павінны быць далучаныя да Рэйху назаўжды: "У асноўным справа зводзіцца да таго, каб асвоіць велізарны пірог з тым, каб мы, па-першае, авалодалі ім, па-другое, кіравалі і, па-трэцяе, эксплуатавалі".

У 1944 годзе ў вызваленым Мінску адбыўся парад 30 тысячаў беларускіх партызан. Дэлегацыя працоўных г.Горкага прывезла партызанам цэлы эшалон падарункаў.

У 1945 годзе пачалася атамная эра: у штаце Нью-Мексіка адбылося выпрабаванне першай атамнай бомбы.

У 1950 годзе на футбольны матч у Рыа-дэ-Жанейра сабралася рэкордная ў гісторыі колькасць гледачоў — 205 тыс. чалавек. Уругвай перамог Бразілію з лікам 2:1 і стаўся чэмпіёнам свету.

У 1990 годзе Вярхоўная Рада Украіны прыняла дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі. Толькі пасля гэтага на такі ж крок рашыўся Вярхоўны Савет Беларусі. Відаць, сапраўды, шлях у Еўропу ляжыць для нас праз Украіну.

ТЕЛЕПРОГРАММА

Среда, 16 июля

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль.
7.45, 18.15 "Музыкальная обойма".
7.50, 17.45 Экономикст.
8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.40 Новости.
8.10 Док. фильм.
8.45 Туробъектив.
9.15 "Мультиклуб".
9.45 Бездельник.
10.15, 15.40, 18.35 Дневник VI Международного фестиваля искусств "Славянский базар".
10.25 Компьютерный полигон.
10.50 "Свадьба старшего брата". Худ. фильм.
12.00 Видимо-невидимо.
15.15 "Приключения Скиппи". Телесериал для детей. (Австралия).
16.30 Гости в дом.
17.00 Музыкальный антракт.
17.15 Концертный сезон.
18.20 Авто-парк.
19.00 Ток-шоу. "Это моя работа".
19.30 Панорама.
20.15 "Цептер" с миссией здоровья по всему миру. Видеофильм.
20.20 Закрытие VI Международного фестиваля искусств "Славянский базар-97". Гала-концерт. В перерывах: (21.55) — "Цептер" с миссией здоровья по всему миру. Видеофильм. (22.00) — "Гость". Короткометражный худ. фильм.
23.50 "Труженики моря". Телевизионный худ. фильм. (Франция-Россия). 2-я серия.

ОРТ

8.00, 14.00, 17.00, 22.50 Новости.
8.15 "Девушка по имени Судьба". Сериал.
9.00 Тема.
9.50 В мире животных.
10.25 Домашняя библиотека.
10.35 Угадай мелодию. Телеигра.
14.15 Премьера мультсериала "Супер-Дейв, Сорвиголова".
14.45 Кактус и К.
14.55 До-ми-соль.
15.15 Зов джунглей.
15.40 "Гарри — снежный человек". Комедийный сериал.
16.05 ...До шестнадцати и старше.
16.30 Вокруг света.
17.20 "Девушка по имени Судьба". Сериал.
18.05 Погода.
18.10 Час пик.
18.35 Угадай мелодию. Телеигра.
19.05 "Чтобы помнили..." Майя Булгакова. Ведущий — Л.Филатов.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.35 Программа передач.
20.40 Марина Неелова и Майя Булгакова в фильме "С тобой и без тебя".
22.10 Документальный детектив. "Сигары" для Фиделя".
23.00 Программа передач.

Канал "Россия"

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.20 Программа передач.
7.25 Лукоморье.
7.50 Посмотри на себя.
8.00 Православный календарь.
8.05 "Клубничка". Телесериал.
8.35 L-клуб.
9.05 "Три новеллы". Мультфильм.
9.15 "Племянник". Короткометражный худ. фильм.
9.45 "Красная книга". Экологическая экспедиция РТР.
14.05 Богема. Б.Тышкевич.
14.45 Парламентарий.
15.10 Деловой автограф.
15.15 Телемагазин "Квантум".
15.25 "Клубничка". Телесериал.
16.15 Там-там новости.
16.25 Избранные.
16.55 Футбол. Чемпионат России. ЦСКА (Москва) — "Динамо" (Москва).
19.35 Добрый вечер.
20.20 "Славянский базар". Торжественное закрытие VI Международного фестиваля искусств.
22.30 Программа передач.
22.35 "Славянский базар". Дневник фестиваля искусств.
22.45 "Славянский базар". Продолжение трансляции.
23.50 Товары — почтой.

Санкт-Петербург

12.30, 15.30, 18.30, 20.25 Информ-ТВ.
12.45 "История любви". Сериал.
13.35 Срок ответа — сегодня.
14.05 Советы садоводам.
14.25 Звездный розыгрыш.
14.55 Хуторок.
15.40 Телеслужба безопасности.
15.55 "Кавингтон Кросс". Худ. фильм (Великобритания).
16.50 "Белая полоса". "Король и шут".
17.25 Телемагазин.
18.45 Спорт.
18.55 "Жоро, Шаро и Мара в кино". Мультфильм.
19.10 "История любви". Сериал.
20.00 — 21.30 Телестанция "Моя Россия".
20.30 "Моя Россия". Поэзия. В.Набоков.
20.45 "Сокровища Петербурга". "Новые поступления".
20.55 "Парадоксы истории". "Царственный узник".
21.30 "Кавингтон Кросс". Худ. фильм (Великобритания).
22.20 Телеслужба безопасности.

НТВ

5.00 Сегодня утром.
8.15 Лучшие цирки мира. "Цирковые приключения". Часть 1-я.
9.15, 17.30 Программа для детей "Улица Сезам".
9.45 Новости кино.
10.00 Лучшие цирки мира. "Цирковые приключения". Часть 2-я.
11.00, 13.00, 15.00 Сегодня днем.
11.20 Своя игра.
11.50 Детям. Бабушкины сказки. Мультфильм "Тихая поляна".
12.00 Меломания. "Роберт Палмер".
13.20 Мир кино. Джордж Бернс в лирической комедии "О, боже! Ты — дьявол" (США).
15.10 Кинотеатр юного зрителя. Худ. фильм "Голубое дерево". (Аргентина — Италия).
16.00 Дистанция 60.
17.00 Криминал.
17.15 Впрок.
18.00, 21.00 Сегодня вечером.
18.40 Герой дня.
19.05 Мир кино. Бо Бриджес и Кифер Сазерленд в психологическом триллере "Время убивать" (США).
21.45 Час сериала. "Крутой Уокер: правосудие по-техасски". (США).
22.40 Времечко.
23.00 Сегодня в полночь.
23.20 "Футбольный клуб" представляет чемпионат России. 18-й тур.
0.10 Кино не для всех. Паоло и Витторио Тавиани. Философская драма "Хаос". Часть 1-я (Италия).

ТВ-6 Москва

14.00 Программа передач.
14.05 Кинотеатр ТВ-6. История Государства Российского. "Сестры".
16.05 Сериал для подростков "Флиппер".
16.35, 23.15, 0.20 Диск-канал.
17.00 Телемагазин "Спасибо за покупку!"
17.10 Аптека.
17.20, 23.00 Дорожный патруль.
17.35 Частный случай.
17.50 Сериал "Семья Кэмпбеллов".
18.55, 20.05, 22.45 Шесть новостей.
19.05 Ток-шоу "Я сама": "Наша дружная семья".
20.20 "Славянский базар-97". "75 лет в жизни, 65 на сцене — Борис Брунов". (Концерт для конферансье с оркестром).
22.10 Те Кто.
0.00 Знак качества.

8-й канал

18.00 Программа Кеннета Копланда.
18.30 Телесериал.
19.30 Аэробика "Новый Эдем".
20.00 Мультфильм.
20.30 "Горец-3". Сериал.
21.30 Школа настоящих мужчин.
21.45 "Труп моего врага". Худ. фильм.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 229-28-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 229-29-04.

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя адказнасці не нясе. Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ЗАТ "Летувас рытас". Адрас: г. Вільнюс, пр-т Гедыміна, 12а. Падпісаны ў друк у 21.00. Фармат А-2. Тыраж: першы завод —50 200 экз. Заказ №1381